# Стыпендыя праграма Sur-Place Фонда ім. Конрада Адэнаўэра па Беларусі

Стыпендыяльная праграма для студэнтаў і студэнтак з Беларусі

### Хто мы:

Фонд ім. Конрада Адэнаўэра (ФКА) - гэта нямецкі палітычны фонд, блізкі да Хрысціянска-дэмакратычнага саюза Германіі (ХДС). Наша місія ад заснавання ў 1955 годзе складалася ва ўмацаванні дэмакратыі ў Германіі. Конрад Адэнаўэр (1876-1967) быў першым канцлерам Германіі, які аб'яднаў хрысціянска-сацыяльныя, кансерватыўныя і ліберальныя традыцыі. Яго імя асацыюецца з дэмакратычнай рэканструкцыяй Заходняй Германіі, замацаваннем знешняпалітычнага курса ў русле трансатлантычнай супольнасці каштоўнасцяў, візіяй аб'яднання Еўропы і арыентацыяй на сацыяльную рынкавую эканоміку. Яго духоўная спадчына працягвае заставацца нашымі задачай і абавязкам адначасова. Сёння ФКА мае замежныя прадстаўніцтвы больш чым у 100 краінах.

### Нашыя жаданні:

Матываваць людзей фармаваць уласную будучыню ў сугуччы з каштоўнасцямі і прынцыпамі Конрада Адэнаўэра. У нашай працы па ўсім свеце мы ўносім свой уклад у прасоўванне дэмакратыі, верхавенства закона, сацыяльнай рынкавай эканомікі і развіццё ўстойлівых партнёрскіх адносін. Каб забяспечыць мір і свабоду, мы падтрымліваем бесперапынны дыялог па пытаннях знешняй палітыкі і палітыкі бяспекі, а таксама абмен паміж культурамі і рэлігіямі.

### Наша мэта:

Адкрываць таленты, прасоўваць таленты.
Для нас гэта азначае падтрымку адданых і таленавітых маладых людзей з краіны і за мяжой і падрыхтоўку іх да перайманння адказнасці ў палітыцы і грамадстве, бізнесе, навуцы і СМІ, а таксама ў сектары культуры. Мы разглядаем падтрымку таленавітых і амбіцыйных студэнтаў як інвестыцыю ў будучыню нашай краіны і краін, з якіх паходзяць нашы стыпендыяты і стыпендыяткі.

## Мы прапануем:

Мы выдзяляем стыпендыі беларускім студэнтам і студэнткам, якія жадаюць атрымаць ступень бакалаўра, магістра ці доктара навук ў адным з літоўскіх універсітэтаў. Навучэнцы атрымліваюць 150 еўра ў месяц. Праграма пачынаецца з выпрабавальнага тэрміну ў 12 месяцаў, які можа быць падоўжаны да канца курса. Абавязковым з'яўляецца ўдзел у семінарах, таксама магчымыя асабістыя кансультацыі.

Мы таксама прапануем розныя семінары спецыяльна для стыпендыятаў, накіраваныя на паглыбленне тэхнічнай і агульнаадукацыйнай кваліфікацыі.

Мы забяспечваем міждысцыплінарны абмен, які часта прысутнічае ў акадэмічным навучанні ў недастатковым памеры. Дыяпазон тэм уключае гістарычныя, палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя праблемы.

## Мы падтрымліваем:

студэнтаў і студэнтак усіх дысцыплін з выдатнымі поспехамі, грамадска-палітычна або сацыяльна ангажаваных, якія маюць беларускае грамадзянства і вучацца ў ВНУ Літвы.

## Мы чакаем:

Нашы патрабаванні да прэтэндэнтаў на стыпендыяльную праграму грунтуюцца на:

- іх дасягненнях ў школе і ва ўніверсітэце, іх агульнай адукацыі і іх гатоўнасць глядзець за межы сваёй вобласці навучання;

- іх цікавасці да каштоўнасцяў, якія прадстаўляе ФКА, і да яго палітычнага зместу і тэматыкі; гатоўнасць развіваць уласны пункт гледжання і праяўляць талерантнасць да тых, хто думае інакш;

- іх добраахвотнай працы на карысць іншых людзей і грамадства;
- іх матывацыі, іх патэнцыяле, іх паводзінах і іх сацыяльнай кампетэнтнасці.

Мы таксама чакаем ад нашых стыпендыятаў актыўнага ўдзелу ў распрацоўцы новых ідэй.

## Як падаць заяўку:

Даслаць у беларускае прадстаўніцтва Фонду ім. Конрада Адэнаўэра наступныя дакументы ў выглядзе аднаго pfd-файла на адрас violeta.mycik@kas.de

- матывацыйны ліст і CV, зробленае па ўзоры Europass на нямецкай ці англельскай мове (https://www.europass-info.de/) з фатаграфіяй у электронным выглядзе
- сертыфікат, які пацвярджае веданне замежнай мовы з указаннем дасягнутага ўзроўню ў адпаведнасці з Еўрапейскай сістэмай узроўняў валодання замежнай мовай. У выпадку адсутнасці такога сертыфіката, веданне замежнай мовы будзе правярацца прадстаўнікамі ФКА
- дзве рэкамендацыі ад выкладчыкаў ВНУ
- даведка, якая пацвярджае навучанне ў ВНУ
- копія атэстата (у выпадку навучання на бакалаўрскай праграме)
- копія дыплома і выпіскі з адзнакамі (у выпадку навучання на магістарскай/доктарскай праграме)

Заяўкі прымаюцца два разы на год. Даты аб'яўляюцца ў нашых сацыяльных сетках.

## Крокі пасля падачы заяўкі:

Пасля праверкі дакументаў на адпаведнасць нашым патрабаванням, мы прымаем рашэнне аб запрашэнні суіскальніка на сумоўе.  У некаторых выпадках удзельнікі, якія не адпавядаюць усім крытэрам адбору, таксама могуць быць адабраны для сумоўя, калі камісія палічыць, што адпаведнасць такой заяўкі патрабаванням Фонду можа быць дасягнута ў бліжэйшы час.